**Скульбедаў У.**

# ВЫЗНАЧЫЎСЯ НА ДУНАІ

Іван Фірсавіч Несцераў нарадзіўся ў 1904 годзе ў вёсцы Таўкачы ў сялянскай сям'і. На радзіме ў 1924 годзе арганізаваў камсамольскую ячэйку і кіраваў ёй. Да вайны – на камсамольскай і партыйнай рабоце. Вучыўся ў Маскоўскай горнай акадэміі. Працаваў ў дзяржаўных установах.

У Чырвонай Арміі – у 1939–1941 гг. Удзельнік вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Украіну ў 1939 годзе.

У Вялікую Айчынную вайну – на Сталінградскім, 2-м і 3-м Украінскіх франтах.

Намеснік камандзіра батальёна па палітчасці 311-га гвардзейскага стралковага палка (108-я гвардзейская дывізія, 46-я армія, 2-гі Украінскі фронт) гвардыі старшы лейтэнант Несцераў вызначыўся пры фарсіраванні Дуная на тэрыторыі Венгрыі.

Сістэма абароны варожых войск тут уключала некалькі ўмацаваных рубяжоў, якія цягнуліся з поўначы на поўдзень. Асабліва моцнай выглядала абарона ў раёне Будапешта. Для абароны горада з усходу праціўнік пабудаваў тры падковападобныя абарончыя паласы, флангі якіх упіраліся ў Дунай паўночней і паўднёвей венгерскай сталіцы. Першая з трох палос праходзіла на аддаленні 25-30 кіламетраў ад ракі.

4 кастрычніка 1944 года ў ліку першых на чале роты ён уварваўся на рачную прыстань, на якой было знішчана ў рукапашным баі каля 100 гітлераўцаў. Рота адбіла 4 контратакі праціўніка, чым садзейнічала пераправе батальёна праз Дунай.

Званне Героя Савецкага Саюза І.Ф. Несцераву прысвоена 24 сакавіка 1945 года.

**Скульбедаў, У. Вызначыўся на Дунаі / У. Скульбедаў // Ударны фронт (Шклоў). — 2005. — 30 сакавіка. — С. 1.**